ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (1066) ● Чацвер, 24 кастрычніка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## У ГОНАР СЯБРОЎ

На мінулым тыдні ў Мінску адбылася сустрэча навуковых супрацоўнікаў ВНУ Беларусі і Польскай Народнай Рэспублікі, прысвечаная 30-й гадавіне з дня адраджэння Польшчы.

У БДУ ў гэтыя дні гасціла дэлегацыя Ягелонскага універсітэта на чале з прафесарам Ю. Бушкам. Прадстаўнікі сяброўскага універсітэта былі прыняты ў рэктараце, агледзелі бібліятэку, вылічальны цэнтр, пабывалі ў гасцях у фізікаў.

У час сумеснай навуковай канферэнцыі, на якой прысутнічалі прадстаўнікі гістарычнага, філалагічнага і іншых факультэтаў БДУ, з дакладам выступілі дацэнты, дактары Е. Русек, З. Лукаўскі, Л. Шнайдэр, а таксама прафесары А. Я. Супрун і А. С. Кляўчэня.

### КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

## УЛІЧЫЎШЫ ВОПЫТ

### З ДАКЛАДА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ХІМФАКА А. ІВАШКЕВІЧА НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ СХОДЗЕ

Усю сваю работу камсамольскае бюро факультэта ў справаздачным перыядзе прысвячала падрыхтоўцы да XXV з'езда ЛКСМБ і XVII з'езда ВЛКСМ, дастойнай сустрэчы 50-годдзя прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, прапагандзе матэрыялаў з'ездаў і пастаўленых імі задач.

Справаздачны перыяд супадае з другім і трэцім этапамі Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё». За кожнай камсамольскай групай камітэт замацаваў члена камсамольскага бюро, які дапамагаў актыву ў правядзенні заліку.

Ленінскі залік у значнай меры садзейнічаў паляпшэнню індывідуальнай работы ў групах, павышэнню адказнасці кожнага камсамольца перад арганізацыяй.

Важным і адказным момантам Ленінскага заліку з'яўляецца грамадска-палітычная атэстацыя. Факультэцкая камісія па правядзенню атэстацыі арганізавала з кожным камсамольцам субяседаванне, у ходзе якога камсамольцы атрымлівалі канкрэтныя заданні, практычныя парады і рэкамендацыі, а потым на камсамольскіх сходах група ацэньвала работу кожнага з улікам вынікаў яго грамадска-палітычнай практыкі.

Падрыхтоўка будучага спецыяліста не можа быць паспяховай без фарміравання яго грамадскай актыўнасці, грамадзянскай і маральнай пазіцый. Задачы камуністычнага будаўніцтва, само жыццё прад'яўляюць усё большыя патрабаванні да ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў. Нам неабходна і далей удасканальваць формы арганізацыі і правядзення грамадска-палітычнай практыкі, дабівацца больш канкрэтных вынікаў. Мы ж ладыходзім да гэтай важнай справы па-старому, усё дыскуціруем, якія патрэбны формы ўліку і кантролю за яе праходжаннем. Відаць, трэба смялей наладжваць сувязь з вытворчасцю, калгасамі, школамі і арганізоўваць там правядзенне грамадска-палітычнай практыкі, умацоўваць патрабавальнасць да яе праходжання, клапаціцца аб тым, каб яна фарміравала ў студэнтаў лепшыя якасці байцоў ідэалагічнага фронту, арганізатараў вытворчасці. Тут дарэчы адзначыць, што пакуль не аддаецца дастатковай увагі абагульненню работы камсамольскіх арганізацый па правядзенню грамадска-палітычнай практыкі. На жаль, і роля камсамольскіх бюро пры правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі была, на наш погляд, недастатковай. Ёю больш займаліся дэканат і партбюро факультэта.

Вялікую ролю ў станаўленні і развіцці светапогляду камсамольцаў мае правядзенне палітінфармацый. Надышоў час абагульніць вопыт розных факультэтаў і распрацаваць рэкамендацыі па наладжванню больш дакладнай сістэмы правядзення палітінфармацый. Для студэнтаў цікавымі былі б, на наш погляд, і інфармацыі аб перспектывах развіцця вышэйшай адукацыі па краіне і ва універсітэце ў прыватнасці, аб поспехах калектыву нашай ВНУ ў цэлым. Здаецца, асаблівы інтарэс выклікалі б у студэнтаў сустрэчы з кіраўнікамі універсітэта, як гэта практыкуецца кожны год у Новасібірскім універсітэце, з прадстаўнікамі рэктарата, з прадстаўнікамі галіновых міністэрстваў, камсамольскіх органаў і іншых арганізацый.

Адным з галоўных напрамкаў работы камсамольскага бюро факультэта з'яўляецца вучэбна-выхаваўчая работа. Поспехі акадэмічнай камісіі факультэта ў справаздачны перыяд заслугоўваюць падтрымкі і адабрэння. Неаднаразова перад першакурснікамі выступалі выдатнікі вучобы з практычнымі парадамі па арганізацыі працоўнага часу і адпачынку. На пасяджэннях камсамольскага бюро ў першым семестры тры разы павестка дня прысвячалася першаму курсу. Асаблівае месца адводзілася рабоце са старастамі і камсоргамі першага курса, павышэнню ў іх пачуцця адказнасці за справы групы.

Кожны з нас сёння добра разумее, што ў барацьбе за выдатную вучобу значную ролю адыгрывае камсамольская арганізацыя групы. Прыкладам творчага, зацікаўленага падыходу да вучобы з'яўляецца група кафедры неарганічнай хіміі V курса. Тут няма троечнікаў, асноўным прынцыпам адносін з'яўляюцца ўзаемадапамога і патрабавальнасць.

На жаль, у многіх групах усё яшчэ ёсць выпадкі парушэння вучэбнай дысцыпліны, атрымання нездавальняючых адзнак. Таму стварэнне атмасферы нецярпімасці да гультаёў і парушальнікаў дысцыпліны — важнейшая задача камсамольскага бюро факультэта.

У гэтым годзе мы ўвялі практыку штотыднёвай справаздачы стараст акадэмічных груп аб паспяховасці і дысцыпліне перад факультэцкім бюро. Камсамольскаму пражэктару даручана перыядычна праводзіць рэйды з праверкамі наведвання заняткаў.

Значная роля ў павышэнні дысцыпліны і паспяховасці адводзіцца спаборніцтву на лепшую групу. У мінулым годзе па абсалютных паказчыках лепшай аказалася другая група III курса, лепшай па паспяховасці была пятая група II курса. ! добра было б, каб прафбюро і дэканат адзначылі пераможцаў, заахвоцілі іх.

## АКТЫВУ — ПРАКТЫЧНЫЯ ВЕДЫ

Адразу пасля камсамольскіх справаздачна-выбарных канферэнцый на факультэтах камітэт камсамола БДУ арганізуе установачную вучобу з уноў выбраным актывам. Адказныя за работу кожнага сектара камітэта камсамола правядуць заняткі з прадстаўнікамі адпаведных сектараў факультэтаў.

Установачная вучоба пройдзе з 24 па 29 кастрычніка. А затым адказныя за работу ўсіх сектараў кожнага факультэцкага камітэта правядуць у такім жа плане вучобу на сваіх факультэтах. Акрамя таго, кожны сектар на працягу года будзе збіраць семінары-нарады па пытаннях штодзённай работы.

Упершыню ва універсітэце плануецца работа школы групкамсоргаў. Яе аддзяленні арганізоўваюцца ў гэтым годзе на гістарычным, юрыдычным і біялагічным факультэтах.

Праграма заняткаў школы ахоплівае найбольш злабадзённыя пытанні работы камітэтаў. Асноўны ўпор пры яе складанні зроблен на авалодванне пачынаючымі камсоргамі практычнымі навыкамі работы. Першая, уступная лекцыя, пазнаёміць слухачоў са структурай камсамольскай арганізацыі БДУ, з планаваннем работы, дакументацыяй групкамсорга, са зменамі ў Статуце ВЛКСМ у святле рашэнняў XVII з'езда камсамола.

Далей прапануюцца такія тэмы: «Камсамольскі сход: падрыхтоўка, правядзенне, павестка дня», «Часовыя і пастаянныя даручэнні, кантроль за іх выкананнем», «Акадэмічная работа ў студэнцкай групе», «Формы і метады правядзення Ленінскага заліку», «Прынцыпы фарміравання СБА, камсамольская работа на месцах дыслакацыі атрадаў».

Пасля кожнай лекцыі плануюцца семінарскія заняткі, на якіх выступяць вопытныя камсоргі, будзе абмяркоўвацца канкрэтная работа груп.

Заняткі ў школе групкамсоргаў даручана весці кадравым камсамольскім работнікам, сакратарам камітэтаў камсамола факультэтаў. Некалькі заняткаў правядуць работнікі гаркома і райкома камсамола.

Работа школы разлічана на ўвесь навучальны год.

**В. НЯСЮК,**
**член камітэта камсамола БДУ.**

### ПРАКТЫКА



У 50-й сярэдняй школе праходзяць практыку пяцікурснікі геафака. У настаўніцкай Галіна Шыцікава і Алена Турава.

### ПРАКТЫКА



На здымках: урок у VIII класе вядзе Антаніна Шынкевіч.

Фота А. Цыгулёва.

## ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За актыўны ўдзел у ажыццяўленні народнага кантролю Кастрычніцкі раённы камітэт народнага кантролю ўзнагародзіў граматамі Маргарыту Вітальеўну Кнігу, Лідзію Канстанцінаўну Пясткоўскую (універсітэцкая ГНК); Тэліну Іванаўну Запольскую, Аляксандра Ігнатавіча Сцефановіча, Яўгенію Іосіфаўну Тарасевіч (ГНК біяфака); Яфіма Паўлавіча Клопава, Мікалая Адамавіча Каратаева (ГНК вылічальнага цэнтра); Марыю Пятроўну Беразайтэс (ГНК журфака).

## АЦЭНКА АБАВЯЗВАЕ

У студэнтаў V курса гістарычнага факультэта закончылася педагагічная практыка, якая праходзіць у два этапы: чатыры тыдні на IV і пяць — на V курсах. Многія метадысты палічылі неабходным даць студэнтам магчымасць у гэтым навучальным годзе працягваць пачатую імі работу ў тых класах, з вучнямі якіх яны ўжо былі знаёмы, дзе былі прымацаваны ў якасці класных кіраўнікоў. Гэта дапамагло практыкантам, не трацячы часу на знаёмства з класам, адразу, без доўгіх «раскачак» увайсці ў выхаваўчы працэс.

Старанная падрыхтоўка да кожнага ўрока, сістэматычны разбор вопыту настаўнікаў, як паказала практыка, прыносіць велізарную карысць, дапамагаючы практыканту хутчэй пераходзіць да самастойнай работы.

З кожным урокам паляпшаецца не толькі тлумачэнне новага матэрыялу, а і ўменне студэнта правесці апытванне, пракантраляваць адказы вучняў і правільна іх ацаніць, уменне знайсці найбольш падыходзячы метад выкарыстання наглядных дапаможнікаў, вывучэння і разбору гістарычных дакументаў, твораў класікаў марксізму-ленінізму.

Добрае веданне матэрыялу, яго эмацыянальнае выкладанне, высокая культура, уменне хутка знаходзіць кантакт з класам — вось што характэрна для студэнтаў - практыкантаў нашага факультэта.

Аднак фарміраванне настаўніка-гісторыка далёка не вычэрпваецца толькі адным правядзеннем урокаў. У працэсе практыкі студэнт сутыкаецца з цэлым комплексам іншых пытанняў і ў першую чаргу — з арганізацыяй пазакласнай работы, якая з'яўляецца састаўной часткай навучання вучняў. Азнаямленне з рознымі формамі пазакласнай работы і практычнае іх выкарыстанне таксама ў значнай меры дапамагае студэнту набыць неабходныя якасці настаўніка.

Паўсядзённая работа з класам, да якога ён прымацоўваецца ў дапамогу класнаму кіраўніку, патрабуе ад практыканта глыбокага вывучэння вучняў і індывідуальнага падыходу да іх.

Студэнты праводзілі палітінфармацыі, гутаркі, чыталі лекцыі па лініі таварыства «Веды», афармлялі наглядныя дапаможнікі, праводзілі камсамольскія сходы, піянерскія зборы, арганізоўвалі сустрэчы з цікавымі людзьмі, экскурсіі ў музеі Мінска, паходы ў кіно і тэатры.

Выдатна зарэкамендавалі сябе ў перыяд педагагічнай практыкі Т. Карпава, З. Маскавец, Г. Ільяшчук, А. Бяляеў, Л. Якімовіч, С. Кавецкі і многія іншыя. «Студэнты не толькі добра падрыхтаваны тэарэтычна, але і добра выхаваны, у іх ёсць пачуццё адказнасці за даручаную справу», — так ахарактарызавала практыкантаў метадыст, завуч школы № 30 А. А. Корань. «Лічу, што дaвераныя мне студэнты не выпадкова выбралі прафесію настаўніка-гісторыка. Усе яны з выключнай працавітасцю і стараннем адносіліся да практыкі»,—гэта характарыстыка дырэктара школы № 30 С. Е. Міронава.

Выдатныя водгукі аб студэнтах далі метадысты М. М. Разаноўская (СШ № 4), А. Н. Селязнёва (СШ № 9), Н. І. Кутэнка (СШ № 35), Л. С. Храловіч (СШ № 115) і іншыя. Яны лічаць, што большасць нашых студэнтаў ужо гатовы да самастойнай работы ў якасці выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства.

**Ж. ЧЭПА,**
**метадыст гістарычнага факультэта.**




З першага кастрычніка пачаліся заняткі ў чатырох новых лінгафонных кабінетах, абсталяваных навейшай чэшскай апаратурай «Цесла». Адначасова тут могуць удасканальваць свае веды па замежнай мове шэсцьдзесят чалавек.



Студэнты з вялікай ахвотай займаюцца ў гэтых кабінетах.

НА ЗДЫМКУ: заняткі з трэцякурснікамі матфака вядзе загадчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў Т. Ф. Каванава.

Тэкст і фота **А. Цыгулёва.**

ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК

# НАГЛЯДНА ПЕРАКАНАЎЧА

У хімічным корпусе на чацвёртым паверсе размешчан кабінет гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Ужо пры ўваходзе перад вамі адкрываецца вітрына «Літаратура да семінарскіх заняткаў». Тут шырока прадстаўлены творы класікаў марксізму - ленінізму, працы У. І. Леніна, рэзалюцыі і рашэнні з'ездаў, канферэнцый і Пленумаў ЦК КПСС, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па гісторыі партыі.

У «Метадычным кутку» — праграма і планы семінарскіх заняткаў, літаратура: «Арганізацыя і методыка самастойнай работы студэнтаў», «Як вывучаць гісторыю КПСС», «Метадычныя парады па вывучэнню твораў У. І. Леніна», «Вучэбна-метадычны дапаможнік да семінарскіх заняткаў па гісторыі КПСС» і іншыя.

Работнікі кабінета ў любы час дадуць патрэбную вам бібліяграфічную даведку, дапамогуць падабраць літаратуру па тэмах навуковых дакладаў і рэфератаў.

У чытальнай зале кабінета 117 прыгожа аформленых планшэтаў падрабязна ілюструюць найбольш знамянальныя ў гісторыі партыі падзеі.

Кафедра, якую ўзначальвае дацэнт Т. І. Прыцкая, супрацоўнікі кабінета вялікую ўвагу аддаюць прымяненню нагляднасці і тэхнічных сродкаў. У холе прыцягвае ўвагу па-мастацку аформленая светавая дыяпазітыўна - ілюстратыўная выстаўка, якая апавядае пра дзейнасць Камуністычнай партыі Савецкага Саюза па ажыццяўленню ўсіх трох праграм партыі. На лекцыях і семінарскіх занятках выкарыстоўваюцца кінафрагменты па ўсіх тэмах курса гісторыі КПСС пад назвай «Летапіс веку», магнітафонныя запісы прамоў У. І. Леніна, яго паплечнікаў, відных дзеячаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. У кіналекторыі (аўд. 507) арганізаван паказ хранікальна-дакументальных і мастацкіх фільмаў, тэматычна звязаных з гісторыяй КПСС.

Акрамя таго, для студэнтаў - першакурснікаў кафедра і кабінет арганізуюць наведванне музея І з'езда РСДРП, экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы, па Мінску, па месцах баявой і рэвалюцыйнай славы, праводзяць сустрэчы са старымі камуністамі, удзельнікамі грамадзянскай вайны і іншымі вядомымі людзьмі.

Запрашаем першакурснікаў часцей наведваць наш кабінет.

**А. АЛЕЙНІКАВА,**
**загадчыца кабінета гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.**

НА МАТФАКУ

# РОШЫМ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ

Як вы намятаеце, такую назву носіць насценгазета матэматыкаў. А ці ўсё ім па плячы і, урэшце, як яны рашаюць задачы?

— ...Вы знайшлі вуглавыя скорасці. Цяпер вызначце, якія яны — скалярныя ці вектарныя?

— Скалярныя! — чуецца з месца.

— Дакажыце.

— А я лічу, што вектарныя, і вось чаму...

Ідуць практычныя заняткі па тэарэтычнай механіцы ў першай групе III курса. Вядзе іх асістэнт Вольга Мікалаеўна В'ярвільская. Ля дошкі — В. Собаль.

— Цяпер напішыце ўраўненні раўнамернага і роўнапераменнага вярчэння.

Дзяўчына крыху бянтэжыцца.

— Спадзяюся, сёння ўсе выпісалі формулы ў сшытак, — гаворыць Вольга Мікалаеўна.

Ужо пасля заняткаў яна тлумачыла:

— Спецыфіка тут у тым, што студэнтам на трэцім курсе ўпершыню становяцца патрэбнымі ўсе веды, накопленыя за два гады вучобы. Таму спачатку яны некалькі блытаюцца ва ўсёй разнастайнасці формул. Я дала заданне выпісаць іх па раздзелах. Цяпер, калі мы рашаем задачы, трэцякурснікі разумеюць выгаду і рацыянальнасць гэтага.

— ...Добра, Собаль, сядайце.

— Задача наступная: вызначыць скорасць і паскарэнне пункта, які знаходзіцца на паверхні Зямлі ў Ленінградзе, калі...

Задача лёгкая. У іншых групах рашэнне знайшлі ў лічаныя хвіліны. А тут?

— Запамінайце, — зазначае мімаходзь Вольга Мікалаеўна, — як трэба рабіць чарцёж, потым нам яшчэ прыйдзецца шмат рашаць задач па вярчэнню.

Пакуль студэнт выпісвае на дошку даныя, яна ходзіць паміж радоў, нахіляецца да сшыткаў.

— Вы ўжо рашылі? Малайчына. Цяпер задача нумар дванаццаць...

Гэта дзяўчыне, якая сядзіць за мной. А на пярэдняй парце спрабуюць падказаць хлапцу ля дошкі.

— Сандрыгайла, сорам! Калі рашылі, пасядзіце хвіліну ціхенька.

— А вы пачалі правільна. Чаму ж збіліся?

—... Цяпер амега і...

Студэнту ля дошкі не дапамог і канспект. «Нездавальняюча», і ён панура садзіцца на месца.

Выкліканы І. Жыліч таксама доўга б'ецца над вынікам.

— Дзіўна, Жыліч, і вы доўга рашалі, хаця на папярэдніх занятках рабілі гэта хутка і прыгожа. Новая задача...

І зноў аб дошку стукае мел. Сціхлі шэпт, шамаценне. Вольга Мікалаеўна падыходзіць да атрымаўшага двойку.

— Ну, што здарылася? Чаму не разабраліся ў формулах? Мо спісалі без асэнсавання у суседа?

— Не, я проста прапусціў...

— Ну вось...

У аўдыторыі нарастае шум. Хтосьці раіцца з суседам, хтосьці ліхаманкава перагортвае канспект, хтосьці напружана ўглядаецца ў запісы на дошцы.

— Рашайце самастойна. Маё запаветнае жаданне — каб вы на дошку менш усяго глядзелі. Думайце, мяркуйце, спрачайцеся, прапаноўвайце свае асабістыя рашэнні.

— Мы ўжо рашылі.

— А просты спосаб ніхто не знайшоў? Добра, я крыху падкажу. Каму толькі?.. Вось вам, Суркоў, вы павінны адразу ўлавіць думку...

Залівіста звініць званок, парушае цэласнасць, рытм заняткаў. Мы развітваемся. Вольга Мікалаеўна жартуе:

— Ну як, умеюць матэматыкі рашаць задачы?

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕННАГА ДРУКУ

# МЕСЯЦ УДАРНАЙ ПРАЦЫ

«Малайцы!» Менавіта гэтым словам адкрываецца чарговы нумар насценгазеты «Рошым любую задачу» (орган дэканата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый матэматычнага факультэта).

Па добрай традыцыі нумар прысвечан падвядзенню вынікаў сельскагаспадарчых работ. Аб тым, як працавалі юнакі і дзяўчаты на калгасных і саўгасных палетках, яскрава гавораць шматлікія ганаровыя граматы і падзякі, дасланыя ў адрас універсітэта кіраўнікамі гаспадарак Мінскай і Віцебскай абласцей. Яны сведчаць аб энтузіязме камсамольцаў, з якім яны капалі бульбу, сушылі зерне новага ўраджаю, нарыхтоўвалі вітамінную муку, сціртавалі салому і г. д.

У калгасе імя Крупскай Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці працавала дзесятая група. За час ударнай работы быў выцераблен лён на плошчы ў 21 гектар, на 18 гектарах паднята льнотраста, засціртавана 63 тоны саломы, праведзен абмалот ільноголовак з плошчы ў 45 гектараў. Калі ўлічыць, што хлопцы яшчэ нарыхтоўвалі лесаматэрыял, рыхтавалі да зімы фермы, прымалі ўдзел у будаўніцтве і агароджы кармушак для цялятніка, то становіцца зразумела, што работа выканана вялікая.

Па-ўдарнаму працаваў таксама студэнцкі атрад, які ўзначальвала Ірына Васільеўна Лізунова. У саўгасе імя Кірава таго ж Шаркоўшчынскага раёна студэнты выканалі вялікі аб'ём работ, прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці — падрыхтавалі і правялі тры канцэрты мастацкай самадзейнасці, удзельнічалі ў спартыўных мерапрыемствах.

Наогул жа ўсюды, дзе студэнты пакінулі часцінку сваёй працы, працаўнікі вёскі ўспамінаюць іх добрым словам.

**В. ЗАДАЛЯ.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**



На здымку: у чытальнай зале кабінета гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

Фота **А. Цыгулёва.**

СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

# ТУРБОТЫ «ДРУГОГА ДОМУ»

Справаздачна - выбарны сход інтэрната № 7 пачаўся з традыцыйных слоў: «У інтэрнаце пражывае 1162 студэнты, прысутнічае — 745».

Спачатку выступленню старшыні студсавета П. Місюка спадарожнічае ўважлівая цішыня. Ён адзначае добрую работу санітарнай камісіі, аператыўнага атрада, які быў створан пры інтэрнаце, гаворыць аб камісіі насценнага друку і радыёвузле. Асабліва многа ўвагі ўдзяляе старшыня мерапрыемствам, праведзеным па ініцыятыве ідэалагічнай камісіі. Амаль кожны тыдзень у актавай зале праводзіліся вечары адпачынку. Гэта самыя масавыя мерапрыемствы. Праўда, як адзначыў Місюк, і тут «галоўная ўвага была накіравана на эстэтычнае выхаванне, павышэнне культурнага ўзроўню студэнтаў». Ідзе пералік вечароў.

Арганізаваны і праведзены два суботнікі па ўборцы інтэрната і тэрыторыі. Часта выпускаліся «баявыя лісткі», «маланкі», радзей — газеты.

Спартыўныя мерапрыемствы таксама займалі пачэснае месца ў планах работы студсавета. Сталі рэальнасцю турніры па шашках і шахматах, здача норм ГПА.

Рашучая барацьба вялася і з парушальнікамі парадку, з тымі студэнтамі, якія не могуць або не хочуць прытрымлівацца ўстаноўленых правілаў.

І вось па зале хваляй пракаціўся лёгкі шумок, які то ўзрастаў, то амаль заціхаў — старшыня студсавета загаварыў пра недахопы ў рабоце. Дарэчы, быў адзначан факт, які нельга не пракаменціраваць. Місюк з горыччу гаварыў, што «крыўдна было глядзець, як на сустрэчу з галоўным архітэктарам будаўніцтва мінскага метро з усяго інтэрната прыйшло... 8 чалавек!» Так-так, з 1162—8. А яшчэ крыўдней тое, што не прыйшлі члены студсавета, а іх жа 28 чалавек! Так і хацелася запытаць, дзе ж былі яны, актывісты? Ці не тут трэба шукаць «канец ніткі» ад усяго клубка недаробленых спраў, недаслуханых лекцый, ад 40 м² разбітых шыб, 70 паламаных крэслаў, 34 сталоў, 23 выведзеных са строю рэпрадуктараў? Ці не таму першы паверх «дзякуючы асабістаму ўдзелу і дапамозе каменданта і намесніка дэкана фізічнага факультэта А. А. Лабуды» быў прыгожа і ў час аформлен, а потым «без асабістай дапамогі» справа прыпынілася? Не, не падумайце, што тут поўнасцю выключаецца адказнасць кожнага за агульны дом. Але многія выступленні зводзіліся да таго, што вось нейкія «гора-студэнты» ламаюць, разварочваюць, зносяць усё на сваім шляху, а вось мы — і я, выступаючы, і вы, хто сядзіць у зале, не такія. А яны... І не было ні аднаго выступлення, дзе б пачулася: мы растрацілі вось столькі дзяржаўных сродкаў.

Або яшчэ гаворка ішла наступным чынам. На шостым паверсе Капусцін і Шыцік разбілі гаршкі з кветкамі, разламалі столік для часопісаў, выбілі шэсць шыб, паламалі пяць крэслаў! Гэта ўсё вядома. Пра матэрыяльныя страты, нанесеныя інтэрнату гэтымі студэнтамі, з лёгкасцю гаворыцца на сходзе. А чаму б не зрабіць так, як практыкуецца ў інтэрнаце № 1, і потым далажыць сходу, што грошы за паломкі вернуты, шыбы за кошт хуліганаў устаўлены, новы столік паблісквае паліраванымі бакамі, у вазонніцах цвітуць кветкі, купленыя зноў жа за іх грошы. І як вынік з усяго гэтага —сказаць, што Капусцін і Шыцік выселены з інтэрната. Тады б не адзін з любіцеляў «гнуць падковы адным пальцам» сур'ёзна падумаў, куды прымяніць сваю сілу.

На сходзе многа і правільна гаварылі Сінякоў, Дуброўскі, Каралюк — члены студсавета, жыхары інтэрната.

Прарэктар па гаспадарчай рабоце С. А. Ерамееў сказаў:

— Інтэрнат — ваш другі дом, а ён павінен утрымлівацца, як і першы. Памятайце, што ў добрага гаспадара дом заўсёды ва ўзорным парадку!

Выступалі прадстаўнікі рэктарата, прафкома, сакратар партбюро матфака. А вось пра камсамольскія арганізацыі факультэтаў, пра іх ініцыятыву не было сказана ні слова.

Калі гаварылі пра парушальнікаў дысцыпліны, сыпаліся рытарычныя пытанні: «Хіба ж гэта студэнты?», «Хіба ж гэта будучыя інтэлігенты?» І ніхто не прыпомніў, што яны перш за ўсё камсамольцы, што яны парушаюць Статут ВЛКСМ, у якім запісана: «Беражы і памнажай грамадскую сацыялістычную ўласнасць — аснову магутнасці і росквіту Савецкай Радзімы!»

А вось за парушэнне Статута не толькі мае права, але і павінен спытаць камсамольскі актыў.

**Н. ПЯТРОЎСКАЯ.**

# 27 КАСТРЫЧНІКА—50 ГОД З ДНЯ УТВАРЭННЯ УЗБЕКСКАЙ ССР

## СІМВАЛ БРАЦТВА

**У канцы кастрычніка брацкія рэспублікі Узбекістан і Туркменія святкуюць свой пяцідзесяцігадовы юбілей. Гістарычна склалася так, што нават чыста нацыянальнае свята аднаго народа нашай краіны становіцца святам усіх іншых. Асабліва дарагі гэты юбілей тым, хто калі-небудзь пабываў у гэтых рэспубліках, працаваў там.**

Раіса Міхайлаўна Ільінкоўская, выкладчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ, ніколі не забудзе той час, калі яна трынаццацігадовай дзяўчынкай пачынала сваю працоўную дзейнасць у Ташкенце ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

...Раніца, вельмі холадна. Усе 120 навучэнцаў вучылішча пры тэкстыльным камбінаце горада Ташкента спяць. Толькі дзве дзяўчынкі, прачынаючыся, кожную раніцу, пакуль ніхто не бачыць, плачуць. Гэта Рая Ільінкоўская і Тамара Трухан. Так раніцай яны пазнаёміліся, а потым і пасябравалі. Аказалася, абедзве з Беларусі.

Цяжар вайны лёг і на плечы дзяцей і падлеткаў, прымусіў раней часу пасталець, стаць за станкі, дапамагаць фронту.

У пачатку вайны Раіса разам з маці і маленькім братам апынулася ў Варонежы, а потым цэлы месяц эшалон эвакуіраваных, дзе была і сям'я Ільінкоўскіх, дабіраўся да станцыі Курган-Цюбе ў Таджыкістане.

Мясцовыя жыхары цёпла сустрэлі людзей, якіх пазбавіла прытулку вайна. Рая разам з маці стала працаваць у калгасе «Кзыл-юлы». «Гэты калгас быў сапраўды шматнацыянальным, — успамінае Раіса Міхайлаўна. — Жылі вельмі дружна і таджыкі, і беларусы, і украінцы. Асабліва добра запомніліся дабрата і клопат, якімі нас акружалі мясцовыя жыхары. Батыр-ака, старож сельсавета, ведаў рускую мову. Гэта дапамагала ў працы».

А працаваць даводзілася шмат. Днём збіралі бавоўну, а вечарам Раіса спяшалася ў бібліятэку МТС, дзе выконвала абавязкі бібліятэкара.

У 1942 годзе па закліку камсамола яна паехала ў Ташкент на вучобу ў фабрычна-заводскае вучылішча. Як цяжка даводзілася падлеткам, адарваным ад роднай сям'і, роднага краю! У гэтых умовах выкладчыкі, майстры выступалі і ў ролі бацькоў, старэйшых братоў і сясцёр. На ўсё жыццё запомніліся Раісе Міхайлаўне цеплыня і дапамога завуча вучылішча ленінградкі Л. Гольдзінай і выкладчыка Ленінградскага тэкстыльнага інстытута М. П. Растоўцава.

І вось скончана вучылішча. «Цяпер вы, — не без гордасці гаварыў Мікалай Паўлавіч Растоўцаў, — рабочы клас». А «рабочы клас», прызнацца, баяўся спачатку заходзіць у цэх. Работа была вельмі адказная — рамонт станкоў і абсталявання. Нічога, праз тыдзень-два прызвычаіліся, ды яшчэ так працавалі, што хвалілі і дарослыя. Па дзве-тры нормы выконвалі за змену. Увогуле змена — гэта даволі ўмоўнае паняцце. Нярэдка суткамі не выходзілі з цэхаў.

Калі ў 1944 годзе Савецкая Армія пачала вызваляць Беларусь і можна было ўжо вяртацца на радзіму, неяк шкада стала Ташкент, людзей, з якімі Раіса парадніласся ў працы...

Ва універсітэце Раісу Міхайлаўну Ільінкоўскую ведаюць як добрага, чулага і спагадлівага педагога. «Я вельмі многа бачыла і многа атрымала дабра ад людзей, — гаворыць яна.— Рускія, узбекі ў цяжкі час дзяліліся апошняй ляпёшкай. Гады вайны, якія я правяла ў Сярэдняй Азіі, былі не толькі суровай школай працы, але і школай выхавання маральных якасцей, характару, савецкага характару.

Як сімвал брацтва я захоўваю медаль «За доблесную працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Гэты медаль заўсёды мне напамінае аб гадах, калі мацнеў інтэрнацыяналізм нашага народа».

**В. ІОСЬКА,**
**студэнтка журфака.**

## МАРШРУТАМ «ДРУЖБЫ»

Аўтапоезд «Дружба» па гарадах і сёлах рэспублікі быў упершыню арганізаван у нас у Беларусі. Такія паездкі даюць магчымасць замежным студэнтам лепш пазнаёміцца з жыццём, бытам, традыцыямі, культурай народаў, што насяляюць нашу краіну. Цяпер маршруты «Дружбы» пракладзены не толькі па дарогах нашай рэспублікі, а і Украіны, Азербайджана. У гэтым годзе ўпершыню аўтобусы з яркімі плакатамі «Дружба» можна было ўбачыць сярод баваўнавых палёў Узбекістана, на вуліцах Ташкента, Самарканда, Бухары.



**У музеі [illegible]**

Група замежных студэнтаў нашага універсітэта і БПІ прымала ўдзел у падарожжы, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння Узбекскай ССР і Кампартыі Узбекістана. Дні, праведзеныя ў адной з сонечных рэспублік Сярэдняй Азіі, запомніліся не толькі шчодрасцю гарачага паўднёвага сонца, але і жарам сэрцаў нашых гаспадароў, якія зрабілі ўсё, каб госці, прадстаўнікі розных краін свету, пасланцы Масквы і Ленінграда, Мінска і Адэсы, Харкава і Львова назаўсёды запомнілі гэтыя сустрэчы на ўзбекскай зямлі.

За два тыдні мы пазнаёміліся з выдатнымі архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі Ташкента, «Бухары-высакароднай» і Самарканда, «Эдэма старажытнага Усходу», горада, які бачыў і лучнікоў Аляксандра Македонскага, і арабскіх заваяўнікаў, і коннікаў Чынгіз-хана.

Веліччу і магутнасцю вее ад ансамбля Шах-і-Зінда, ад маўзалея Гур-і-Эмір, ад мечэці Бібі-ханым, узведзеных у часы Цімура, які, зраўняўшы з зямлёй старажытную сталіцу Харэзма Ургенч, загадаў усіх таленавітых майстроў - рамеснікаў вывезці ў Самарканд, каб упрыгожыць яго, ад магільні Саманідаў (IX—X ст.) і мінарэта Калян (XII ст.), з якім звязана шмат бытуючых у народзе легенд, у Бухары. З імем вялікага матэматыка і астранома XV ст. Улугбека звязаны такія унікальныя помнікі, як старажытнейшая абсерваторыя, медрэсе ў Бухары, у Самаркандзе, дзе ён сам выкладаў, і Гіждуване. «...Усе яго сародзічы адышлі ў нябыт: хто аб іх успамінае ў наш час? Але ён, Улугбек, працягнуў руку да навук і дабіўся многага», — пісаў А. Наваі, вялікі узбекскі паэт, сучаснік Улугбека.

Гарады чымсьці падобны на людзей: у кожнага свой лёс, свой твар. Але гарады пэўнай краіны, быццам члены адной вялікай сям'і, маюць няўлоўныя рысы фамільнага падабенства, якія можна вызначыць як нацыянальны стыль, нацыянальную своеасаблівасць. Ташкент мае шмат агульнага са сваімі сабратамі, але ўсё ж такі ёсць адна рыса, якая найбольш ярка знайшла сваё адлюстраванне ў гэтым горадзе. Гэта тое новае, што прыйшло да народаў Сярэдняй Азіі з устанаўленнем Савецкай улады.

Філіял музея У. І. Леніна. Прыгожы і арыгінальны будынак, у архітэктуры якога гарманічна спалучаюцца традыцыйныя нацыянальныя матывы і новыя, сучасныя тэндэнцыі ў будаўніцтве, знаходзіцца ў самым цэнтры Ташкента. Больш трох гадзін з цікавасцю слухалі ўдзельнікі аўтапоезда расказ аб тым, як ідэі правадыра пралетарыята У. І. Леніна знайшлі сваё ажыццяўленне ва Узбекістане,ператварыўшы адсталую аграрную ускраіну царскай Расіі, дзе на 100 жыхароў было ўсяго 2 чалавекі, якія ўмелі чытаць і пісаць, у рэспубліку сучаснай індустрыі, высокамеханізаванай шматгаліновай калектыўнай гаспадаркі, перадавой культуры, вартай спадчыны геніяльных, вядомых усяму свету мысліцеляў, вучоных, паэтаў — Харэзмі, Фарабі, Авіцэны, Біруні, Улугбека, Навai.



**Маўзалей Саманідаў (IX—X ст.).**



**Ускладанне кветак да помніка У. І. Леніну ў Ташкенце.**

Сёння Савецкі Узбекістан экспартуе сваю прадукцыю больш чым у 70 краін свету. Адно з вядучых прадпрыемстваў рэспублікі — завод «Ташсельмаш». У час наведання завода двойчы, калі намеснік сакратара парткома сказаў аб тым, што ходавую частку для бавоўна - ўборачных камбайнаў пастаўляе Мінскі трактарны завод, і калі ў аддзеле АСКВ убачылі ЭВМ «Мінск-32», раздаліся апладысменты.

Выказваннем пачуцця брацкай салідарнасці паміж народамі нашых рэспублік з'яўляецца цэлы квартал у жылым раёне Чылanзар, пабудаваны беларускімі будаўнікамі пасля землетрасення 1966 года.

Запомніліся рабятам сустрэчы з рабочымі Самаркандскага фарфора - фаянсавага завода, з майстрамі золаташыцця з Бухары, з моладдзю Самаркандскага архітэктурна - будаўнічага інстытута, са школьнікамі ў піянерскім лагеры.

З гнеўнымі палымянымі прамовамі выступілі ўдзельнікі аўтапоезда на мітынгу салідарнасці з народам Чылі.

Пяць цудоўных дзён, напоўненых захапляючымі паходамі ў горы, спартыўнымі спаборніцтвамі, канцэртамі, сустрэчамі з ветэранамі вайны і артыстамі, купаннем у горных вадаёмах, правялі мы ў спартыўна-аздараўленчым лагеры ў Хумсане.

Загарэлыя, крыху стомленыя, але вельмі задаволеныя, поўныя багатых уражанняў, вярнуліся «мінчане» дадому. Развітваючыся ў аэрапорце, усе аднадушна рашылі: на будучы год едзем у Азербайджан.

**У. БУДАЙ,**
**кіраўнік групы замежных студэнтаў.**
Фота **аўтара.**

## ЗНАЕМЦЕСЯ З НАВІНКАМІ

Па чацвяргах у бібліятэцы БДУ праводзіцца дзень інфармацыі: на сталах і стэндах выстаўляюцца розныя віды выданняў, што паступілі ў бібліятэку за прайшоўшы тыдзень. Тут можна пагартаць старонкі падручнікаў і манаграфій, прагледзець праспекты выдавецтваў, пазнаёміцца з аўтарэфератамі, заглянуць у ілюстраваныя часопісы і альбомы. Прадстаўлены на выстаўцы і навінкі мастацкай літаратуры.

На наступны дзень літаратура з выстаўкі паступае ў кнігасховішча і на розныя пункты выдачы, экспануецца яна і на стэндах новых паступленняў. У навуковай чытальнай зале, напрыклад, ёсць тры вялікія выстаўкі: «Бібліяграфія ў дапамогу навуковай працы», «Новыя часопісы па грамадскіх навуках», «Новыя часопісы па прыродазнаўчых навуках». На іх прадстаўлены рэфератыўныя часопісы, інфармацыйныя бюлетэні, крытыка-бібліяграфічныя матэрыялы і г. д. Яшчэ чатыры невялікія выстаўкі тут жа знаёмяць з часопісамі, што выдаюцца ў СССР і за мяжой, па наступных раздзелах: «Педагогіка», «Мовазнаўства і літаратуразнаўства», «Матэматыка», «Фізіка», «Хімія».

Акрамя гэтых, ёсць у бібліятэцы пастаянныя выстаўкі. Асабліва вялікай увагай карыстаецца тая, што прадстаўляе матэрыялы інфармацыйнага цэнтра вышэйшай школы — «Новае ў вышэйшай школе». Яна знаёміць чытачоў з рэфератыўнай, аглядпай, бібліяграфічнай і экспрэс-інфармацыяй у серыях: «Актуальныя праблемы вучэбнага працэсу», «Камуністычнае выхаванне студэнцкай моладзі. Выхаваўчая работа ў ВНУ», «НАП у вучэбным працэсе» і іншыя. А вось выстаўка «Замежная інфармацыя з розных галін ведаў» расказвае аб новай тэхніцы, кніжных навінках і г. д.

Вялікую ролю ў павышэнні прафесіянальнага ўзроўню саміх супрацоўнікаў бібліятэкі адыгрываюць такія выстаўкі, як «Навінкі бібліяграфіі», «Бібліятэка вышэйшай школы» (з вопыту работы) і іншыя.

**Т. МЕЛЬНІКАВА.**

